# АСАБЛІВАСЦІ МАСТАЦКАГА АЗДАБЛЕННЯ БАТЛЕЙКІ
## (на прыкладзе распрацоўкі Т.У. Гаралевіч)

Т.У. Гаралевіч (Віцебск)

Батлейка – адна з форм лялечнага тэатра. Яна з'явілася на Беларусі ў XVI–XVIII стст. Беларуская батлейка мае свае канструктыўна-дэкарацыйныя, вобразныя асаблівасці і шматлікія факты выкарыстання яе ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Мастацтва батлейкі прыйшло на Беларусь даўно з Заходняй Еўропы і стала замацавалася тут. За некалькі стагоддзяў яна ўвабрала ў сябе культурныя традыцыі, пануючыя на беларускіх землях і пераўтварылася ў неад'емную частку беларускай традыцыйнай культуры. Батлеечная скрыня набыла рысы, характэрныя для архітэктуры менавіта беларускіх цэркваў і касцёлаў, аздаблялася традыцыйнай разьбой па дрэве, выцінанкамі.

Прадстаўленне суправаджалася ігрой на традыцыйных народных інструментах, калядными спевамі. Нават адзенне батлеечных лялек паўтарала традыцыйнае, характэрнае для Беларусі адзенне. Вечная гісторыя Нараджэння Хрыстова, шаленства цара Ірада і трагічнае забойства немаўлят быццам пераносілася на шматпакутную беларускую зямлю. Людзі плакалі і радаваліся разам з героямі, спявалі калядныя гімны, ухваляючы Нараджэнне Хрыста. У інтэрмедыях, якія паказвалі бытавыя сцэнкі з жыцця простых людзей, пазнавалі недзе сябе, знаёмых і смяяліся разам з імі. Можна сказаць, што мастацтва батлейкі ўрасло карэннямі ў духоўнае традыцыйнае жыццё і з'яўляецца не толькі помнікам матэрыяльнай, але і духоўнай культуры беларусаў.

Пасля перыяда забыцця ў сярэдзіне XX ст., зараз можна прасачыць вялікі ўздым і аднаўленне цікавасці да беларускай батлейкі. Праходзяць фестывалі батлеечных тэатраў, у дамах культуры, музеях, навучальных установах з'яўляюцца свае батлейкі, дзе дэманструюцца батлеечныя спектаклі, якія становяцца цэнтрам эстэтычнага, культурнага і духоўнага выхавання дзяцей і дарослых. Кожная батлейка ўяўляе сабой асобны твор мастацтва, у якім мастак перадае свае эстэтычныя, культурныя погляды. Праца над батлейкай патрабуе валодання шматлікімі мастацкімі навыкамі і ўменнямі. Батлейка аб'ядноўвае ў сабе некалькі відаў мастацтва. Тут і разьба па дрэве, ткацтва, скульптура, роспіс і музычнае суправаджэнне. Гэта маленькі лялечны тэатр з глыбокімі традыцыямі.

На Беларусі вядома ў асноўным пяць відаў батлеек: аднапавярховыя (панарамныя); двухпавярховыя з лялькамі, якія рухаліся, і кананічным аздабленнем; двухпавярховыя са спецыяльнай вежкай; батлейкі пабудаваныя па прынцыпу ценевага тэатра, батлейкі з празрыстымі дэкарацыямі, якія мяняліся ў час спектакля.

Лялечны тэатр першагу тыпу атрымаў назву ад скрыні з панарамай, дзе знаходзіліся карціны нараджэння Хрыста. У далейшым, месца нерухомай карціны занялі лялькі.

Батлейка другога тыпу, уяуляе сабой вялікую, больш двух метраў вышынёй, скрынку, якая складалася з двух асобых частак. Гэта было двухпавярховае памяшканне, што нагадвала царкву: на яе даху знаходзіліся адзін ці тры купала.

Да трэцяга тыпу лялечнага тэатра адносяцца двухпавярховыя збудаванні, на даху якіх рабілася вежка круглай, шасцікутнай ці квадратнай формы. Падлога гэтай вежкі ўяўляе сабой круг. Па краях ставіліся фігуркі мужчын і жанчын, якія трымаліся за рукі.

Да чацвёртага тыпу батлеек адносяцца старажытныя тэатры, у якіх спалучалася панарамная батлейка з ценевым тэатрам.

Да пятага тыпу батлеечнага тэатра належала батлейка з празрыстымі дэкарацыямі, гэта значыць афармленне, якое вельмі моцна набліжаецца да сістэмы дэкарацый сучаснага лялечнага тэатра. Такая батлейка была характэрна толькі для Беларусі [1].

Сучасная батлейка XXI ст. працягвае сваю эвалюцыю, абапіраючыся на старадаўнія традыцыі. Зараз майстры выкарыстоўваюць навейшыя матэрыалы і тэхналогіі пры праектаванні і стварэні батлеек.

У 2022 годзе кафедра музыкі педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава замовіла распрацаваць мастацка-дэкаратыўнае аздабленне батлейкі. Спачатку быў распрацаваны праект, які выкананы ў рэдактары 2D-графікі (мал. 1). Прадстаўлены праект, які з'яўляецца аўтарскай распрацоўкай Т. У. Гаралевіч, дазваліў у кароткі тэрмін ажыццявіць яго выкананне ў матэрыяле, пры выкарыстанні лазернага станка для рэзання фанеры і роспісу дэталяў акрылавымі краскамі.



Мал. 1 – Праект батлейкі (2D-графіка)

За аснову мастацкага вырашэння ўзята выцінанка – беларускі від народнага мастацтва. Сучасная выцінанка – гэта ўжо не проста аздоба канкрэтных месцаў ці кампанентаў інтер’ера, а самадастатковая мастацкая з’ява з уласнымі законамі, задачамі, стылістыкай, прызначэннем [3]. Адной з разнавіднасцю выцінанак, з'яўляюцца так званыя выклеянкі – шматколяровыя кампазіцыі выразаныя з паперы і налепленыя адзін на аднаго. Падобны прыём быў узяты і для распрацоўкі элементаў мастацкага афармлення батлейкі. Выразанныя на лазерным станку элементы з фанеры, распісваліся ў патрэбны колер (белы, шэры, сіні) і размяшчаліся ў дзьва або тры слоі. Такая тэхналогія дапамагала ствараць вельмі прыгожыя і ажурныя малюнкі. Матывы дэкору беларускіх выцінанак надзвычай разнастайныя. Так і ў дадзеным праекту відавочна перавага геаметрычных матываў. Справа тут не толькі ў прастаце выканання, але і ў еднасці з традыцыйнымі геаметрычнымі матывамі ткацтва, вышаўкі, разбярства (мал. 2).



Мал. 2 – Батлейка

Верхняя частка дзвярэй аздоблена сілуэтамі ажурных кветак і птушкамі. Такі арнітаморфны матыў звязаны с язычніцкай міфалогіяй. У большасці выпадкаў іх называлі проста «птушкі». Па сілуэту яны нагадваюць галубоў, пеўняў, сустракаюцца і экзатычныя, яўна больш позняга паходжання – «павы» [3].

Унутраны і наружны бок расчыненых дзвярэй батлейкі, аформлены беларускімі геаметрычнымі матывамі. У ніжняй частцы дзвярэй размешчаны круглыя шматпрамянёвыя разеткі, якія выражаюць

старажытны сімвал сонца. Зубчыкі, шэрагі трохвугольнікаў, крыжыкі звязаныя з вяснавымі святамі. Кампазіцыя кожнай часткі распрацоўкі выканана сіметрычна і мае арнаментальна-дэкаратыўны і сюжэтна-тэматычны характар, што таксама было ўласціва для беларускіх выцінанак.

Цэнтральная частка разработкі, вырашана, архітэктурнымі матывамі – маленькімі вясковымі домікамі і вялікімі, стылізаванымі дрэвамі. Такое аздабленне дазваляе ставіць п’есы на матэрыяле казак і сцэн з народнага жыцця.

Зверху над цэнтральнай часткай, змяшчаецца зорка і дэкаратыўныя зорачкі-кветачкі, якія таксама аздабляюць усё мастацкае вырашэнне батлейкі.

Каляровае вырашэнне батлейки складаецца з трох колераў: шэрага, белага і сіне-васільковага. Такія колеры не толькі сустракаецца ў беларускім народным мастацтве, але і з’яўляюцца асноўнымі ў фірменным стыле ВДУ.

Такім чынам можна канстатаваць, што традыцыйныя асаблівасці мастацкага аздаблення батлейкі захоўваюцца, але выступаюць у саюзе з новымі, сучаснымі тэхналогіямі. Новыя рысы мастацкага афармлення праявіліся ў тым, што ўнутраннае ўпрыгожванне распрацавана на прыкладзе традыцыйнай выцінанкі, але з дапамогай сучасных матэрыалаў і новых тэхналогій.

Трансфармацыі нацыянальных традыцый у сучасным праектаванні, дазваляе студэнтам і магістрантам ВДУ засвоіць гісторыю і тэорыю традыцыйнага лялечнага тэатра Беларусі, выхоўвае павагу і цікавасць да родных традыцый, гісторыі, сваіх каранёў, садзейнічае эстэтычнаму выхаванню моладзі.

*Крыніцы и літаратура:*


1. Барышаў, Г. І. Беларускі народны тэатр “Батлейка” / Г. І. Барышаў, А. К. Саннікаў – Мінск : Выдавецтва Міністэрства вышэйшай , сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР, 1962. – 161, [18] с.;
2. Котович, Т. В. Театральная культура Витебщины XX века : монография / Т. В. Котович ; М-во образования РБ, УО "Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова". – Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2009. – 180 с.https://rep.vsu.by/handle/123456789/2038 (дата обращения 05.10.2022);
3. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва / Я. М. Сахута – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 180 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця).